Анатоль Грыцкевіч

# Інвентар Мірскага замка 1688 года як гістарычная крыніца

Інвентарамі ў XVI–XVШ стагоддзях на Беларусі называліся вопісы феадальных уладанняў, гарадоў, зрэдку крэпасцей. Інвентары былі не толькі крыніцамі па гісторыі аграрных адносін, гарадоў і мястэчак, дэмаграфіі, але і гісторыі архітэктуры. Як гістарычная крыніца, яны даволі дакладныя, бо складаліся на месцы шляхам агляду і апытвання насельніцтва, абмеру і запісаў у прысутнасці прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва.

Адным з такога роду апісанняў Мірскага замка з'яўляецца інвентар 1688 г., які знаходзіцца ў Радзівілаўскім архіве, паколькі Мір у XVI–XVШ стст. быў асяродкам радзівілаўскай латыфундыі, якая насіла назву Мірскага графства паводле аднаго з тытулаў Радзівілаў "граф на Міры". Пра гэты інвентар у сваіх работах пісалі даследчыкі гісторыі замкаў і крэпасцей А.П. Грыцкевіч [1, 214] і пасля М.А. Ткачоў [2, 41–42], звярнуўшы ўвагу на фартыфікацыю і ўзбраенне Мірскага замка.

Аднак інвентар 1688 г. патрабуе больш дакладнага аналізу, у тым ліку і крыніцазнаўчага. Гэтая гістарычная крыніца сведчыць пра рэстаўрацыйныя работы ў замку пасля яго аблогі і ўзяцця войскам князя А.М. Трубяцкога падчас вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. і аднаўлення фартыфікацыі.

Інвентар Мірскага замка быў складзены па загаду князя Ежы (Юрыя) Юзэфа Радзівіла (1668–1689), 11 уладальніка замка, нясвіжскага ардыната, падчашага літоўскага, а крыху пазней, з 1688 г. – ваяводы трокскага. Інвентар складзены Міхалам Лыскевічам на польскай мове і 15 кастрычніка 1688 г. перададзены Казіміру Міхалу Шульцу, гараднічаму мірскаму. Акрамя тытульнага ліста, апісанне Мірскага замка мае 11 старонак, уключаючы адваротныя. Апісанне складзена пасля рэстаўрацыйных работ [1, 214].

Змест інвентару падзяляецца на часткі са сваімі загалоўкамі: 1) апісанне Мірскага замка; 2) апісанне ніжніх склепаў; 3) апісанне вышэйшых склепаў; 4) апісанне сярэдніх пакояў; 5) апісанне вышэйшых пакояў; 6) другая частка вышэйшых пакояў насупраць брамы [3, 13–19].

Пачынаецца апісанне Мірскага замка 1688 г. з агульнай яго характарыстыкі: "Замак Мірскі, у квадрат з камня пабудаваны, з чатырма вежамі па рагах, а пятая вежа высокая, нанова адрэстаўраваная, земляным валам акружаная. На прадзамчу ў вале новапастаўлены будынак (барбакан) з стайняй і вазоўняй; да якога пры ўваходзе падвойная брама з дошак... Пры ўваходзе у замак мураваны рэдут. Брама падвойная... з форткай" [3, 14].

Каля галоўнай брамы злева знаходзіўся будынак вартоўні ("кардыгарда", "да муру прыробленая, з дошак"). У вартоўні была печка "з белай кафлі, 3 лавы, стол. Мелася і адно шкляное вакно. Пры ўваходзе ў браму стары пад'ёмны мост, акаваны чатырма жалезнымі пасамі, з іх адзін пас надламаны. У гэтага маста два ланцугі, на двух кольцах з прабоямі, у адным ланцугу 15 звёнаў, а ў другім – 16. У муры па абодва бакі два кальца дубовыя на двух жалезных прутах, на якіх пад'ёмны мост узнімаюць і апускаюць... У браме 3 жалезныя гарматы, не апраўленыя" [1, 214].

Гарматы знаходзіліся ў байніцах. Унутры замка, па левым баку ад уваходу, пры браме знаходзілася вялікая мураваная пякарня.

З такой жа дакладнасцю даецца апісанне розных частак замка: ніжніх склепаў, дзе пералічваюцца гаспадарчыя памяшканні пад брамай – кухмістарская “ізба”, “ізба белая кухонная (памяшканне для ежы) мураваная”, “бровар”, “стайня”, “лазня” [3, 14–15]. Адзначалася, што вокны ў памяшканнях – з кратамі. Аналагічнае апісанне склепаў вышэйшых у розных частках замка.

У такім жа парадку па чатырох “кватэрах” замка даецца ў інвентары 1688 г. апісанне “пакояў сярэдніх” і “пакояў вышэйшых”. Згадваюцца каменныя ўсходы, што ідуць наверх ад пякарні да “сярэдніх пакояў”, усе пакоі, каморы і каморкі, калідоры і сені ў чатырох “кватэрах”. Сярод пакояў вылучаюцца “скарбцы” для захавання каштоўнасцей, сталовая і іншыя памяшканні. Вежы наверсе былі ўпрыгожаны меднымі арламі, якія ўзвышаліся на вялікіх жалезных прутах. На вялікай вежы над замкавай брамай знаходзіўся “нованапраўлены” вялікі гадзіннік і звон для адбівання гадзін з жалезным молатам. Вежы былі пакрыты дахоўкай. Даволі часта ў інвентары Мірскага замка сустракаецца слова “нованапраўленыя”, “новазробленыя” [3, 17–19]. Фактычна апісанне 1688 г. сведчыла аб нядаўнім рамонце замкавых памяшканняў і збудаванняў. Сходы былі пабудаваны з дубу, апраўлены жалезам, былі і “кручаныя”, што вялі з вежаў уніз; яны злучалі ўсе паверхі. Згадваюцца пакоі, што мелі вокны “ў поле” і ў двор замка. Асобна вызначаны сталовыя і вялікая сталовая, а таксама скарб уладальніка замка (“скарбец”) і стайня з нарыхтаванымі аўсом і сенам.

У пачатку XVIII ст. адным з элементаў абароны замка былі земляныя валы на некаторай адлегласці ад самога замка, якія абкружалі яго з усіх бакоў. На кожным рагу гэтых умацаванняў – бастыёны галандскага тыпу [3, 43], што было характэрным для першай паловы XVII ст., калі ў Беларусі прымяняўся старагаландскі тып фартыфікацыі [1, 205].

Інвентар Мірскага замка 1688 г. быў у комплексе з іншымі дакументамі Радзівілаўскага архіва, якія тычацца Міра, Мірскага графства і замка. Ужо тагачасныя архівісты вылучалі ў Нясвіжскім замку Радзівілаў справы, што належалі да Мірскай латыфундыі, у асобны комплекс, які існаваў у такім выглядзе і ў пазнейшы час.

Характарызуючы ў цэлым інвентар Мірскага замка 1688 г. як гістарычную крыніцу, трэба адзначыць дакладнасць гэтага дакумента, бо ён быў складзены з пэўнай мэтай перадачы самога замка ў кіраванне гараднічаму, начальніку замка, які адказваў за захаванне і ўзнаўленне абарончых збудаванняў, забеспячэнне замка зброяй, боепрыпасамі, харчаваннем.

Паколькі інвентар 1688 г. мае важнае значэнне ў раскрыцці гісторыі замка, то ёсць неабходнасць яго выдання для карыстання ім не толькі даследчыкамі, але і больш пашыраным колам аматараў старажытнасці.

*Літаратура:*


1. Грицкевич А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (Социально-экономическое исследование истории городов). – Мн., 1975.
2. Ткачоў М.А. Замкі Беларусі (XIII–XVII). – Мн., 1977.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГА Б), фонд 694, воп. 2, спр. 4468, лл. 1–19.